**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна
# за студзень 2021 г.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага месячніка вернутай кнігі

У студзені ў публічных бібліятэках ДУК быў праведзены раённы месячнік вернутай кнігі. У рамках месячніка ў бібліятэках прайшлі дні і тыдні дараванага запазычальніка, непамятлівага чытача, акцыі «Падары кнігу бібліятэцы», «Дар душы бескарыслівы – кніга».

**3 студзеня**

У бібліятэцы прайшла святочная навагодняя акцыя «Стань першым!». У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі першых наведвальнікаў чакалі сюрпрызы: навагоднія віншаванні ад бібліятэкараў, прыгожыя паштоўкі і падарункі.

ЦБ

## Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Карысныя канікулы»

У рамках акцыі «Карысныя канікулы» ў бібліятэках для дзяцей ладзіліся экскурсіі, гульнявыя і літаратурна-музычныя праграмы.

**8 студзеня**

Падчас гульнявой экскурсіі «Зіма і кніга – дзень цудоўны!» бібліятэкар займальна расказала дзецям аб правілах карыстання бібліятэкай. Юныя наведвальнікі даведаліся, як жывуць кнігі ў «кніжным доме», пазнаёміліся з выставай «Снежный веночек сплетает зима», чыталі вершы і казкі зімовай тэматыкі.

Лукская ПБ, 7 чал.

**9 студзеня**

Бібліятэкары запрасілі дзяцей на бібліяглобус «Мы цікавыя свету – свет цікавы нам». З дапамогай кніг і часопіса «Мир путешествий» прысутныя завочна пабывалі ў розных краінах і паўдзельнічалі ў віктарыне «Вокруг света без билета».

Дзівінскі ф-л, 14 чал.

## Мерапрыемствы да навагодніх святаў і Раства

Ва ўсіх бібліятэках ГУК прайшлі літаратурна-забаўляльныя, конкурсныя праграмы і іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя навагоднім святам і Раству Хрыстоваму.

**6 студзеня**

Літаратурнае падарожжа «У Новы год з новымі кнігамі» здзейснілі наведвальнікі бібліятэкі. Ім прапанавалі навагодняе прадказанне, гульню «Літаратурны пошук», сюрпрызы ад літаратурных герояў і рэкламу новых кніг.

Залеская ПБ, 15 чал.

**6 студзеня**

У бібліятэчнай групе ў сацыяльных сетках адбылася прэзентацыя віртуальнай кніжна-ілюстрацыйнай выстаўкі «Пусть Новый год с книгой придёт!». Гледачам прапанаваны кнігі пра зіму, Новы год і Раство Хрыстова.

ЦБ

**6 студзеня**

Вакальны гурт «Фантазія» цэнтральнай раённай бібліятэкі павіншаваў калег і чытачоў з Раством Хрыстовым, старым Новым годам і Вадохрышчам, размясціўшы на сайце ўстановы і ў сацыяльных сетках відэаролікі з песнямі ў выкананні гурта.

ЦБ

**13 студзеня**

Да свята Раства Хрыстовага бібліятэкары правялі эстафету дабрыні «Раства чароўныя імгненні». Паўдзельнічаць у акцыі мог кожны жыхар аграгарадка Гарадзец. У бібліятэцы, царкве і крамах размясцілі спецыяльныя скрынкі для сувеніраў. У выніку супрацоўнікі бібліятэкі сфармавалі комплексныя падарункі для дзяцей з 13 шматдзетных, маламаёмасных сем'яў і тых, у якіх выхоўваюцца дзеці з абмежаванымі магчымасцямі. Бібліятэкары і іерэй Георгій Чарвякоўскі з традыцыйнымі святочнымі віншаваннямі ўручылі падарункі адрасатам. *(Літаратура і мастацтва. 2020. 29 студзеня. С. 16; Кобрин-информ. 2020. 28 января. С. 13.)*

Гарадзецкі ф-л, 67 чал.

**17 студзеня**

У фармаце анлайн-чытанняў «Сугучча слоў жывых» прайшло пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо». Паэты дзяліліся адзін з адным сваімі новымі вершамі, а на ўроку па вершаскладанню выконвалі практыкаванні па развіццю літаратурна-мастацкіх здольнасцей.

ЦБ, 6 чал.

**26 студзеня 2021**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы падвялі вынікі конкурсу на лепшае анлайн-віншаванне «С Новым годом, Рождеством – настоящим волшебством!». 1-е месца заняла Надзея Момлік з Дзівіна, 2-е – кабрынчанка Алена Котава, а 3-е – жыхар Залесся Эдуард Парфянюк. Пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі і памятнымі падарункамі.

ЦБ

## Іншыя мерапрыемствы

**5 студзеня**

Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі прэзентаваны адразу 3 выданні: «Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны. 2021 – 2025», «Імі ганарыцца Кобрыншчына», «Людзі навукі нашага краю». Два апошнія выдадзены ў рамках краязнаўчага асветніцкага праекта «Славутыя імёны маёй малой радзімы» і сталі чарговымі біябібліяграфічнымі даведнікамі ў серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны».

ЦБ, 17 чал.

**15 студзеня**

Наведвальнікі бібліятэкі здзейснілі падарожжа ў чароўны свет кніг падчас літаратурнай віктарыны «Кнігі цікавыя, вясёлыя, цудоўныя». 2 каманды дзяцей удзельнічалі ў 5 турах: «Размінка. З кнігай па жыцці», «У свеце літаратуры», «Персанажы любімых кніг», «Каму належаць гэтыя рэчы», «Пярэкрут». Пераможцы атрымалі прызы.

Стрыгаўская ПБ, 10 чал.

**19 студзеня**

У рамках Года народнага адзінства ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі адбылася прэзентацыя выстаўкі-панарамы «Беларусь: ад слаўнага мінулага да дастойнай будучыні». Выстава складаецца з трох раздзелаў: «Беларусі роднай славутыя крокі», «Адзінства праз культуру», «Чытая Радзімы старонкі».

ЦБ, 32 чал.

**21 студзеня**

Пасяджэнне аматарскага клуба «Экоша» прайшло ў фармаце літаратурна-пазнавальнай гульні «Ключ да загадак прыроды». Дзеці пазнаёміліся з кнігамі пра прыроду, даведаліся аб разнастайным свеце прыроды, удзельнічалі ў конкурсах-загадках «Жывая і нежывая прырода», «Угадай па гуку», адказвалі на пытанні віктарыны «Знаўцы прыроды», «Самы ўважлівы».

Арэхаўская ПБ, 7 чал.

**25 студзеня**

У бібліятэцы прайшла прэзентацыя выстаўкі-інсталяцыі «Запаветы добрай даўніны», прысвечаная народным дэкаратыўна-прыкладным традыцыям вёскі Павіцце і блізкіх населеных кропак. Асаблівае месца ў экспазіцыі займае убор свахі вёсак Павіцце і Лелікава, традыцыя вырабу і выкарыстання якога ў 2018 годзе занесена ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Павіццеўская ПБ, 27 чал.

Ефціфеева Н. П.
8-01642-3-85-81